# З УЗНАГАРОДАЙ ВАС, ТАВАРЫШЫ!

## У Прэзідыуме Вярхоўнага Савета СССР

За поспехі, дасягнутыя пры будаўніцтве Гродзенскага азотнатукавага завода, першага Салігорскага калійнага камбіната і Полацкага нафтаперапрацоўчага завода Савета народнай гаспадаркі Беларускай ССР Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 15 лютага 1964 года ўзнагародзіў 297 удзельнікаў будаўніцтва, якія найбольш вызначыліся.

Сярод узнагароджаных звання Героя Сацыялістычнай Працы ўдастоен СЕЛІВАНАЎ Анатоль Васільевіч—брыгадзір праходчыкаў Беларускага будаўнічага шахтапраходчага ўпраўлення трэста „Шахтспецбуд“ Дзяржаўнага вытворчага камітэта па мантажных і спецыяльных будаўнічых работах СССР.

Ордэнам Леніна ўзнагароджаны брыгадзір праходчай брыгады першага Салігорскага калійнага камбіната І. Г. АКАЛЕЛАЎ, шафёр Салігорскай аўтабазы № 5 С. П. ПРАХАРОВІЧ, брыгадзір комплекснай брыгады камуністычнай пр цы будаўнічага ўпраўлення № 122 трэста № 3 І. П. ЧАБАТАР і іншыя.

Вялікая група будаўнікоў узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам „Знак пашаны“, медалем „За працоўную доблесць“ і медалем „За працоўную адзнаку“.

*ПРАВАФЛАНГОВЫ ВЯЛІКАЙ ХІМІІ*

## Шахцёрская слава



—Трымай вось так, — Анатоль Васільевіч Селіванаў уключыў пнеўматычны лом, націснуў на ручку—і лёскат, падобны на стук кулямёта, заглушыў гамонку ў ствале. Адна за другой адвальваліся цвёрдыя глыбы. Непакорлівая парода нехаця паддавалася волі чалавека.

Мікалай Каранько, сялянскі хлопец з вёскі Мяцявічы, не зводзіў вачэй з дакладных рухаў свайго настаўніка. Недзе ў глыбіні душы шавяльнулася крупіца зайздрасці, хацелася, вельмі хацелася, каб і ў яго руках быў такім жа паслухмяным шахцёрскі інструмент.

Брыгада Анатоля Селіванава была амаль поўнасцю ўкамплектавана навічкамі. Сабраліся людзі розных узростаў, розных прафесій. Цяпер іх аб'ядноўвала адно жаданне—як хутчэй прайсці ствол. Вучыцца прыходзілася ў працэсе работы. Хто ведаў больш, дапамагаў тым, у каго была ў гэтым патрэба.

Няма чаго падрабязна апісваць будні праходчыкаў брыгады. Дастаткова сказаць, што праходку ствала на першым калійным камбінаце селіванаўцы закончылі першымі. Там, дзе некалі гаспадарылі яны, цяпер працуюць калійшчыкі. Па ствалу нагара ідзе сільвініт, а ўніз спускаецца складанае абсталяванне.

Не засталіся без справы і праходчыкі. Ім даверылі будаваць шахты на другім калійным камбінаце. К гэтаму часу брыгада ўжо стала моцным, згуртаваным калектывам. І ў гэтым не малая заслуга брыгадзіра.

Кожны дзень звенні Пылікава, Кудраўцава, Кізеева, Зайко, якія ўваходзяць у састаў брыгады, перавыконвалі зменныя заданні. У суткі брыгада давала па паўтара метра гатовага ствала, затым павялічвала выпрацоўку, даводзячы яе нярэдка да двух метраў.

З асаблівым уздымам папрацавалі селіванаўцы напярэдадні снежаньскага Пленума ЦК КПСС. Яны далі слова да дня адкрыцця форума партыі выканаць гадавое заданне. І слова сваё стрымалі. Ствол быў пройдзен на месяц раней тэрміну. Гэта была выдатная перамога будаўнікоў.

У калектыве, дзе брыгадзірам Селіванаў, добра разумеюць усю адказнасць даручанай справы. Кожны праходчык ведае, што краіна патрабуе ўсё больш і больш мінеральных угнаенняў. Лютаўскі Пленум ЦК КПСС прыняў праграму інтэнсіўнага развіцця сельскай гаспадаркі на аснове шырокай хімізацыі.

І вось, каб здзейсніць рашэнні партыі, селіванаўцы, як і ўсе праходчыкі другога калійнага камбіната, працуюць у гэтыя дні з падвоенай энергіяй. Дасягнут першы і другі гарызонты залежаў калійнай солі. Вядзецца гідраізаляцыя ствала і яго збойка з другім ствалом.

22 прабітыя ствалы, 14 год самаадданай працы на будаўніцтве шахт — такі працоўны рахунак камуніста Анатоля Селіванава.

І вось радыё прынесла радасную вестку: брыгадзіру перадавой на будаўніцтве другога Салігорскага калійнага камбіната скразной праходчай брыгады Беларускага будаўнічага шахтапраходчага ўпраўлення трэста «Шахтспецбуд» Анатолю Васільевічу Селіванаву Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Таварышы па рабоце цёпла павіншавалі свайго брыгадзіра з высокай узнагародай, ад усяго сэрца пажадалі Анатолю Васільевічу новых поспехаў у працы.

У. НОВІК.